## Рэгіянальнае развіццё-важнейшы кірунак сацыяльна-эканамічнай палітыкі рэспублікі Беларусь

**І Т. Кіслая**
*дацэнт кафедры эканомікі і кіравання*
*УА Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці, г. Мінск, Беларусь,*
*e-mail: tatiana_kislaya@tut.by,*
*ORCID: 0000-0001-7448-3250*

Рэгіянальнае развіццё-адзін з важнейшых напрамкаў сацыяльна-эканамічнай палітыкі любой краіны. У апошні час пытанні рэгіянальнага развіцця набываюць усё большую актуальнасць у Рэспубліцы Беларусь у сувязі з ростам дыспрапорцый ў развіцці не толькі абласцей, але і раёнаў.

Дзеянні дзяржавы ў сферы рэгіянальнага развіцця, з аднаго боку, не павінна нашкодзіць такім натуральным эканамічным працэсам як урбанізацыя, пашырэнне агламерацый, а з другога не дапусціць крытычнага пагаршэння сітуацыі ў рэгіёнах, што пагражае іх устойліваму развіццю.

Да паказчыкаў, якія дэманструюць дыспрапорцыі ў развіцці рэгіёнаў можна аднесці наступныя (малюнак):




**Малюнак. Паказчыкі развіцця рэгіёнаў**

Дэпрэсіўныя рэгіёны не ў стане самастойна выйсці з крызіснай сітуацыі, для гэтага неабходна адпаведная дапамога з боку дзяржавы (падтрымка развіцця эканомікі і сацыяльнай сферы), якая павінна быць зацікаўлена ў яе аказанні, паколькі дэпрэсіўныя рэгіёны вядуць да негатыўных праяў палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага характару.

Пры гэтым асноўнымі задачамі дзяржавы з’яўляюцца:

• падтрыманне прымальнага ўзроўню эканамічнай дыферэнцыяцыі рэгіёнаў;

• стварэнне ў дэпрэсіўных рэгіёнах канкурэнтаздольных суб’ектаў

эканамічнай дзейнасці і фарміраванне фактараў эканамічнага росту ўнутры рэгіёнаў (рэструктурызацыя эканомікі ў мэтах стварэння передумоў для іх устойлівага развіцця). Выхад рэгіёна з дэпрэсіўнага стану з'яўляецца складаным працэсам, які патрабуе ў кожным канкрэтным выпадку аб'яднанне адпаведных механізмаў і працэдур, у тым ліку і спецыяльныя меры па сацыяльнай абароне насельніцтва дадзенай тэрыторыі.

Улічваючы, што эканамічныя адрозненні рэгіёнаў абумоўліваюцца натуральнымі фактарамі, якія цяжка паддаюцца ўздзеянню мер рэгіянальнай палітыкі, увагу трэба засяродзіць на зніжэнні няроўнасці ў якасці жыцця і стварэнні максімальна роўных магчымасцей у сферы адукацыі і аховы здароўя незалежна ад рэгіёна. У якасці магчымых напрамкаў можна прапанаваць наступныя меры:

1. Зрушэнне прыярытэтаў дзяржаўных інвестыцый ад рэалізацыі буйных камерцыйных праектаў да інвестыцый у чалавечы капітал, у першую чаргу адукацыя і ахова здароўя, што дасць магчымасць знізіць няроўнасць магчымасцей і больш поўна раскрыць патэнцыял рэгіёнаў.

2. Інвестыцыі ў інфраструктуру, накіраваныя на павышэнне мабільнасці працоўнай сілы і гнуткасці рэгіянальных рынкаў працы, якія дазволілі б часткова перайсці ад міграцыі паміж рэгіёнамі на пастаяннае месца жыхарства да маятнікавай міграцыі.

3. Садзейнічанне развіццю рэгіянальнай занятасці ў першую чаргу праз праграмы развіцця малога бізнэсу, перападрыхтоўкі найбольш уразлівай часткі працоўнай сілы і падтрымкі самазанятасці.

4. Зніжэнне цэнтралізацыі бюджэту і ўвядзенне «бюджэту грамадзянскага ўдзелу» з мэтай больш актыўнага ўцягнення супольнасцяў у мясцовае самакіраванне і стварэння стымулаў для мясцовых органаў улады да эфектыўнага развіцця эканомікі рэгіёна.

5. Падтрымка фарміравання агламерацый (рэгулятарная і інфраструктурная) з мэтай павышэння іх канкурэнтаздольнасці ў кантэксце іншых краін рэгіёну і сусветнай эканомікі ў цэлым.

6. Дыферэнцыраваны падыход да стратэгій развіцця рэгіёнаў і ключавых паказчыкаў эфектыўнасці кіраўнікоў мясцовых органаў улады з мэтай уліку спецыфікі рэгіёна для павышэння эфектыўнасці работы мясцовых органаў улады і максімальна поўнага раскрыцця патэнцыялу рэгіёнаў (прамысловага, турыстычнага, сельскагаспадарчага і інш.).

**Ключові слова:** рэгіянальнае развіццё; палітыкі; сацыяльна-эканамічнай.

## Список використаних джерел

*1. Чубрик А., Мазоль О. Причины межрегиональных диспропорций в Беларуси и возможные направления региональной политики URL: http://beroc.by/publications/policy_papers/prichiny-mezhregionalnykh-disproportsiy-v-belarusi/?sphrase_id=2016*

*2. Мазоль О. Депрессивные регионы URL: http://beroc.by/publications/policy_papers/*

*depressivnye-regiony/?sphrase_id=2016*
*3. Экономическая энциклопедия / гл. редактор Л. И. Абалкин. М.: Экономика, 1999. 1055 с.*
*4. Мазоль О. Опыт зарубежных стран в сфере развития депрессивных регионов URL: http://beroc.by/publications/policy_papers/opyt-zarubezhnykh-stran-v-sfere-razvitiya-depressivnykh-regionov/?sphrase_id=2016*